# МАНІТОРЫНГ РАЗВІЦЦЯ СІТУАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ
## КАСТРЫЧНІК 2008 – ЛЮТЫ 2009 г.

## Кароткі агляд:

Перыяд шасцімесячнага дыялогу паміж Беларуссю і Еўрасаюзам падыходзіць да завяршэння, у сувязі з чым беларускія грамадскія арганізацыі ў супрацоўніцтве з замежнымі партнёрамі[1] падрыхтавалі гэты маніторынг дзеля таго, каб дэталёвая інфармацыя пра рэальны стан рэчаў у Беларусі была даступная асобам, адказным за прыняцце рашэння пра перагляд часовага прыпынення дзеяння санкцыяў у дачыненні да пэўных прадстаўнікоў беларускага кіраўніцтва.

Справаздача ўтрымлівае наступныя высновы:

- Крокі, зробленыя беларускімі ўладамі ад пачатку дыялогу, мелі пераважна несістэматычны і павярхоўны характар і з'яўляюцца цалкам зваротнымі. Зусім невялікая колькасць арганізацый атрымала выгоду ад гэтай сітуацыі, у той час як вельмі мала было зроблена дзеля стварэння нармальных умоваў для функцыянавання незалежнага грамадскага і медыя-сектараў у цэлым.

- Нязначныя змены не закранулі сутнасці праблемаў, з якімі сёння сутыкаецца грамадзянская супольнасць. Працягваюцца абмежаванні ў правах і фундаментальных свабодах, што выклікае занепакоенасць і ўказвае на тое, што Беларусь яшчэ не распачала працэсу рэальнай дэмакратызацыі. У прыватнасці, улады надалей вядуць палітыку рэпрэсіяў супраць моладзевых палітычных і грамадскіх актывістаў, а таксама рэлігійных меншасцяў. Але дзеля кантроля над грамадскімі і палітычнымі актывістамі на змену адкрытаму стварэнню палітычных вязняў прыйшлі больш майстэрскія формы рэпрэсіяў, такія як гвалтоўны прызыў ў армію і прысуды "абмежавання волі".

- Прадпрынятыя беларускімі ўладамі крокі па паляпшэнні сітуацыі ў краіне вітаюцца міжнароднай супольнасцю, але разглядаюцца як мінімальныя высілкі з мэтай дэманстрацыі добрай волі Еўрасаюзу і жадання працягваць дыялог. Падчас свайго лютаўскага візіта Горан Ліндблад, старшыня Камітэту па Палітычных Справах Парламентскай Асамблеі Рады Еўропы (ПАСЕ) абвясціў, што "пакуль на Беларусі не назіраецца нават сымбалічнага прагрэса па дэмакратызацыі."

- Нягледзячы на тое, што прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і палітычнай апазіцыі запрасілі да прадстаўлення сваіх ідэяў па магчымых рэформах, сапраўдны дыялог яшчэ не распачаўся. Тры створаныя ўладамі рады дазваляюць невялікай колькасці незалежных экспертаў і палітыкаў сустракацца з прадстаўнікамі ўладаў і выражаць свае меркаванні, але ўзгаданыя рады маюць рэкамендацыйны характар і не маюць уплыву на працэс прыняцця рашэнняў. На сённяшні дзень

[1] Складзена Камітэтам абароны рэпрэсаваных "Салідарнасць", Праваабарончым цэнтрам Вясна, ГА "Беларускай Асацыяцыяй Журналістаў" (БАЖ), Каардынацыйнай радай прадпрымальнікаў, газетай "Белорусы и рынок", Інстытутам менеджэрства і прыватызацыі, Асамблеяй НДА і Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў у супрацоўніцтве з групай міжнародных арганізацый, якія займаюцца Беларуссю.

падставаў сцвярджаць, што ідэі паходзячыя з незалежных колаў былі ўключаныя ў стратэгію ажыццяўлення зменаў, няма.

Падчас сустрэчы з Хаўерам Саланай, Вярхоўным прадстаўніком ЕС па агульнай знешняй палітыцы і палітыцы бяспекі, прэзідэнт Лукашэнка публічна заявіў, што яму б не хацелася бачыць "аніякіх пасрэднікаў" у перамовах паміж ЕС і Беларуссю. Яго ўяўленні аб дыялогу абмежаваныя выключна кантактамі на ўрадавым узроўні. Такім чынам, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, як, напрыклад, дэмакратычная апазіцыя ўнутры самой Беларусі і за мяжой, выкоючаюцца з перамоўнага працэсу. Прадстаўнікі ЕС, насупраць, настойвалі на ўдзеле грамадзянскай супольнасці і палітычнай апазіцыі ў працэсе дыялогу.

У разглядаемы перыяд  адбыліся наступныя падзеі:

- Беларускія ўлады абнародавалі "неафіцыйныя прапановы", дзе была абазначана невялікая колькасць пытанняў, якія сталі часткай цяперашняга дыялогу з ЕС. Сярод гэтых прапановаў было вяртанне двух незалежных выданняў ("Наша Ніва" і "Народная воля") у сістэму дзяржаўнага распаўсюду; арганізацыя ў супрацоўніцтве з АБСЕ круглага стала па абмеркаванні новага закону аб СМІ і правядзенне дэталёвых кансультацый па паляпшэнні выбарчага заканадаўства краіны з прадстаўнікамі Офісу БДІПЧ/АБСЕ.

- Беларускімі ўладамі былі таксама зроблены некаторыя "дадатковыя крокі" насустрач лібералізацыі, не пазначаныя ў "неафіцыйных прапановах", а менавіта:
  - Рэгістрацыя Руху "За свабоду";
  - Рэгістрацыя Гомельскай філіі партыі БНФ;
  - Стварэнне трох грамадска-кансультацыйных радаў: Міжустаноўская працоўная група па распрацоўцы дзяржаўнага маркетынгу, Каардынацыйная Рада па пытаннях СМІ, і Рада па правах чалавека пры Адміністрацыі Прэзідэнта. Першапачаткова ў рады ўваходзілі прадстаўнікі незалежнай грамадзянскай супольнасці і/альбо палітычнай апазіцыі.
  - Нацыянальная Рада па працоўных і сацыяльных пытаннях зацвердзіла план дзеянняў па выкананні рэкамендацыяў Міжнароднай арганізацыі працы датычна прафсаўзаў (МАП).

- У галіне свабоды слова, нягледзячы на адкрыццё доступу ў сістэму дзяржаўнага распаўсюду двум раней узгаданым газетам, іншыя аналагічныя заяўкі з боку СМІ былі адхіленыя альбо засталіся без адказу. Усяго 13 афіцыйна зарэгістраваных незалежных газет і адзін незалежны часопіс надалей не могуць распаўсюджвацца праз сетку шапікаў "Саюздрук".

- У галіне свабоды асацыяцыяў, прынамсі, тры НДА, у тым ліку gраваабарончы wэнтр "Вясна", і адзін прафсаюз атрымалі адмову ў рэгістрацыі. Больш за тое, некалькі спроб перарэгістрацыі такіх вядомых грамадскіх арганізацый пакуль застаюцца без адказу.

- Крымінальныя справы былі ўзбуджаныя супраць некалькіх дэмакратычных актывістаў. Аляксандр Баразенка, напрыклад, быў

прысуджаны да аднаго года абмежавання волі за ўдзел у дэманстрацыі прадпрымальнікаў.

- Шэраг заявак на правядзенне пікетаў і дэманстрацыяў былі адхіленыя, у тым ліку заяўкі на правядзенне мерапрыемстваў з нагоды 60-х угодкаў прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

- Не было зроблена аніякіх захадаў дзеля перагляду супярэчлівых крымінальных артыкулаў, якія значна абмяжоўваюць і перашкаджаюць функцыянаванню незалежных грамадскіх ініцыятываў. Не быў адменены і прэзідэнцкі дэкрэт №533, які рэгулюе парадак карыстання офіснымі памяшканнямі грамадскімі арганізацыямі і палітычнымі партыямі. Аб сапраўдным жаданні палепшыць клімат працы НДА сведчыла б скасаванне альбо ўнясеньне паправак ў гэтую норму заканадаўства.

- Беларускія ўлады працягваюць парушаць Венскую Канвенцыю, адмаўляючыся выконваць рашэнні Камітэта па Правох Чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў па справах ліквідацыі праваабарончага цэнтру "Вясна" і пазбаўлення рэгістрацыі Гомельскай НДА "Грамадскія Ініцыятывы".

## 1.Уводзіны

13 кастрычніка 2008 г. Рада Еўрапейскага Саюза вырашыла прыпыніць дзеянне санкцыяў, ужытых супраць некаторых прадстаўнікоў вышэйшага беларускага чынавенства, на тэрмін ў паўгады. Гэта рашэнне было прынятае, зважаючы на вызваленне ў жніўні 2008 г. палітычных вязняў: Аляксандра Казуліна, Сяргея Парсюкевіча і Андрэя Кіма.

Рада адзначыла, што яе рашэнне будзе перагледжана праз 6 месяцаў пасля правядзення ацэнкі прагрэсу, што беларускія ўлады прадэманструюць у пэўных сферах датычна "фундаментальных свабод, якія ўключаюць свабоду выказвання, свабоду сродкаў масавай інфармацыі, а таксама свабоду сходаў і палітычных асацыяцыяў".

19 лістапада Брусель атрымаў так званыя "неафіцыйныя прапановы", дзе беларускае кіраўніцтва заявіла пра магчымасць рэалізацыі канкрэтных захадаў па лібералізацыі дзеля таго, каб прадэманстраваць свае намеры нармалізаваць адносіны з ЕС".

Гэтыя крокі павінны былі складацца з арганізацыі міжнароднага круглага сталу па абмеркаванні заканадаўства, якое рэгулюе дзейнасць Інтэрнэту і сродкаў масавай інфармацыі з удзелам прадстаўнікоў АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ і Мінскага офіса АБСЕ пад эгідай і ў актыўным супрацоўніцтве з Міністэрствам інфармацыі; дазволу дзвюм незалежным газетам ("Нашай Ніве" і "Народнай волі") вярнуцца ў сістэму дзяржаўнага распаўсюду і шапікі "Белсаюздруку"; пацверджання гатоўнасці да дэталёвага абмеркавання рэкамендацый БДІПЧ/АБСЕ, скіраваных на паляпшэнне нацыянальнага выбарчага заканадаўства.

Каб дапоўніць агульную стратэгію ЕС адносна Беларусі, Еўрапейскі парламент (ЕП) ухваліў дзве рэзалюцыі. Абедзве рэзалюцыі, ад 9 кастрычніка 2008 г. і ад

24 студзеня 2009 г. падкрэсліваюць, што беларускія ўлады працягваюць ухіляцца ад набліжэння да міжнародных стандартаў у галіне дэмакратыі і правоў чалавека. Рэзалюцыі дэманструюць, што ў якасці паказальнікаў прагрэсу ЕП звяртае ўвагу ў першую чаргу на канкрэтныя дзеянні, а не пустыя заявы беларускіх уладаў.

Каб забяспечыць асобаў, адказных за перагляд рашэння аб прыпыненні дзеяння санкцый, падрабязнай інфармацыяй пра развіццё становішча на Беларусі, удзельнікі сустрэчы міжнародных арганізацыяў, якія займаюцца беларускімі пытаннямі (Варшава, кастрычнік 2008 г.), вырашылі падрыхтаваць гэту маніторынгавую справаздачу. Яна была складзена на падставе факталагічнага матэрыялу, сабранага беларускімі грамадскімі арганізацыямі, пры актыўным удзеле міжнародных экспертаў.

Узгаданыя сустрэчы міжнародных арганізацыяў, ладзяцца два разы на год, пачынаючы з 2002 г., і аб'ядноўваюць донарскія арганізацыі і НДА з Еўропы і ЗША, што працуюць па Беларусі ў такіх сферах як правы чалавека і развіццё дэмакратыі. Мэтай сустрэчаў з'яўляецца абмен досведам, распрацоўка агульнай стратэгіі ды паляпшэнне каардынацыі міжнароднай палітыкі  ў дачыненні да Беларусі. Сорак восем НДА і донарскіх арганізацыяў з Чэхіі, Германіі, Даніі, Літвы, Нарвегіі, Польшчы, Славакіі, Швецыі, ЗША, а таксама прадстаўнікі Еўрапейскай камісіі ўзялі ўдзел у апошняй сустрэчы ў Варшаве.

Гэты маніторынг вывучае развіццё сітуацыі ў галіне асноўных свабодаў, маючы на ўвазе свабоду СМІ, свабоду асацыяцыяў і сходаў, звяртае ўвагу на свабоду ад палітычнага пераследу і незаконныя затрыманні, рэпрэсіі супраць грамадскіх актывістаў і адсочвае апошнія эканамічныя тэндэнцыі.

## 2. Свабода СМІ

Як і было заяўлена ў "неафіцыйных прапановах", 25-26 лістапада 2008 г. дзве незалежныя газеты "Народная воля" і "Наша Ніва" атрымалі дазвол вярнуцца ў сістэму падпіскі "Белпошты" і магчымасць распаўсюджвацца праз дзяржаўную сетку шапікаў "Белсаюздруку". Гэтыя выданні былі выключаныя з сістэмы распаўсюду дзяржаўнага манапаліста ў 2005 г., напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 г. Зараз лічыцца, што гэтыя дзве газеты знаходзяцца ў свабодным доступе для чытача і прадаюцца ў розных рэгіёнах Беларусі, аднак іх даволі цяжка знайсці ў шапіках.

На практыцы, газэты складана знайсці. Паводле кантракту, на рэалізацыю па Мінску Белсаюздрук прымае толькі 1800 асобнікаў "Нашай Нівы". Больш за тое, за свае паслугі "Белсаюздрук" і "Белпошта" бяруць за свае паслугі 55 працэнтаў ад цаны газэтаў, што робіць доступ незалежным выданням да гэтых дзяржаўных манаполіяў вельмі дарагім. Дзяржаўная палітыка эканамічнай дыскрымінацыі прывяла да цяжкага фінансавага становішча незалежных выданняў, што ў сваю чаргу не дазваляе ім скарыстацца сённяшняй сітуацыяй і значна павялічыць наклад. Да таго ж, новы статус гэтых зарэгістраваных выданняў не змяніў варожага падыходу да іх з боку ўладаў, што не дазваляе ім спаборнічаць з дзяржаўнымі выданнямі на роўных правах. Напрыклад, два маладыя актывісты былі затрыманыя за распаўсюд бясплатных рэкламных асобнікаў "Народнай волі" ў Брэсце ў снежні 2008 г., а журналістцы "Народнай

Волі" Марыне Коктыш было адмоўлена ў акрэдытацыі для асвятлення падзеяў у Нацыянальным сходзе РБ.

Нягледзячы на гэтыя крокі, 13 іншых зарэгістраваных незалежных газэтаў і адзін часопіс дагэтуль застаюцца па-за сістэмай дзяржаўнага распаўсюд. У разглядаемы перыяд большасць з іх звярталіся ў "Белпошту" і "Белсаюздрук" з просьбай узнавіць падпіску і дамовы на продаж. За выключэннем аднаго выдання, усе атрымалі адмовы.

Усе незалежныя газеты сутыкаюцца з неабходнасцю перарэгістрацыі з прычыны ўступлення ў дзеянне 8 лютага 2009 г. новага закону аб СМІ. Гэты працэс выклікаў сур'ёзную занепакоенасць сярод незалежных медыяў у сувязі з тым, што у мінулым беларускія ўлады выкарыстоўвалі практыку перарэгістрацыі дзеля значнага скарачэння колькасці незалежных выданняў. Новы закон быў зацверджаны Нацыянальным Сходам у чэрвені 2008 г. і падпісаны прэзідэнтам Лукашэнка 17 ліпеня. Закон забараняе сродкам масавай інфармацыі прымаць фінансаваю і матэр'яльную дапамогу з-за мяжы, ад асобаў, юрыдычных адзінак і "ананімных крыніц", а таксама абмяжоўвае максімальную долю замежнага капітала ва ўстаноўчым фондзе СМІ да 29 працэнтаў. Закон таксама забараняе журналістам супрацу з замежнымі СМІ без акрэдытацыі і зазначае санкцыі за "распаўсюд ілжывай інфармацыя, якая можа зашкодзіць дзяржаве альбо дзяржаўным інтэрэсам".

Новы закон жорстка крытыкуецца экспертамі па пытаннях свабоды слова, якія папярэджвалі беларускія ўлады аб неабходнасці прывесці закон у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі, з такіх арганізацыяў, як Журналісты без межаў (Reporters Without Borders), Арыткул 19 (Article 19), Камітэт абароны журналістаў (Committee to Protect Journalists), а таксама шэрагам міжнародных арганізацый, у тым ліку АБСЕ. 1 ліпеня 2008 Еўрапейская камісія асудзіла прыняцце ўзгаданага закона пра СМІ. Камісар ЕС па знешняй палітыцы і Еўрапейскай палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднэр зрабіла наступную заяву: "Я асуджаю прыняцце беларускім парламентам новага закону пра СМІ, што надалей будзе абмяжоўваць свабоду друку ў Беларусі. Свабода друку – гэта неад'емная частка дэмакратычнага грамадства".

Як адзначалася ў "неафіцыйных прапановах" з боку беларускіх уладаў, дыскусія пад назвай "Інтэрнэт-медыі: Выклікі XXI стагоддзя" адбылася 24 лістапада 2008 г. пад эгідай беларускага Міністэрства інфармацыі, прадстаўнікоў АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ і супрацоўнікаў Мінскага офісу АБСЕ. Мерапрыемства аб'яднала міжнародных адмыслоўцаў, беларускіх чыноўнікаў, і людзей, якія працуюць у незалежных медыях. Беларуская асацыяцыя журналістаў ацаніла сустрэчу як станоўчы знак. Асабліва вітаўся ўдзел у круглым стале дзяржаўных прадстаўнікоў, чаго раней не здаралася.

Дыскусія разгарнулася вакол розных поглядаў на новы закон пра СМІ. Незалежныя журналісты выказвалі занепакоенасць тым, што існуючае заканадаўства па СМІ можа быць ужыта і ў дачыненні да Інтэрнэт-выданняў з мэтай скарачэння аб'ёму аб'ектыўнай інфармацыі. Прадстаўнікі уладаў, аднак, заявілі, што кантроль за інфармацыйнай плынню неабходны ім дзеля таго, каб папярэдзіць з'яўленне ў Інтэрнэце такой шкоднай інфармацыі як, напрыклад, дзіцячая парнаграфія. Прадстаўнікі незалежнага сектару ў сваю чаргу баяцца,

што гэты механізм будзе выкарыстоўвацца як нагода для далейшага абмежавання да доступу інфармацыі ў Інтэрнэце.

Сустрэча павінна была вызначыць ці кампраміс аб добраахвотнай рэгістрацыі па заяўцы будзе прымальным для абодвух бакоў. Заяўная рэгістрацыя дазволіла б уладам, не выходзячы за рамкі заканадаўства, забяспечыць онлайн выданні, якія хочуць лічыцца СМІ, адпаведным статусам. 25 студзеня міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч, быццам бы, паабяцаў, што для Інтэрнэт-выданняў фармальная рэгістрацыя ўводзіцца не будзе.

26 лістапада 2008 г. старшыня Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення пры Адміністрацыі Прэзідэнта Усевалад Янчэўскі сустрэўся з сябрамі ГА “БАЖ”. Нягледзячы на тое, што ніякіх канкрэтных вынікаў сустрэча не мела, прадстаўнікі ГА “БАЖ” схільныя ацэньваць яе пазітыўна, бо гэта першая сустрэча такога кшталту.

29 кастрычніка ўлады пагадзіліся стварыць Грамадскую Каардынацыйная Рада па пытаннях СМІ. У сярэдзіне студзеня Савет Міністраў прапанаваў ўдзел у гэтай радзе тром незалежным дзеячам СМІ, а менавіта Жанне Літвіной, старшыні ГА “БАЖ”, Алене Міронавай, галоўнаму рэдактару “Камсамольскай Праўды ў Беларусі” і галоўнаму рэдактару “Народнай Волі” Іосіфу Сярэдзічу. Дзейнасць Рады на дадзены момант пакуль не прынесла канкрэтных вынікаў.

Праблематычным па-ранейшаму застаецца пытанне акрэдытацыі журналістаў, якія працуюць на замежныя СМІ. Два польскія журналісты атрымалі часовую акрэдытацыю, у той час як супрацоўнікам Еўрапейскага радыё для Беларусі і Радыё “Рацыя” было адмоўлена. Яшчэ тры карэспандэнты Радыё “Рацыя” атрымалі адмову ў студзені 2009 г. на той падставе, што раней яны працавалі ў Беларусі без акрэдытацыі.

20 снежня 2008 г. спадарожнікавы тэлеканал Белсат, які вяшчае на Беларусь з тэрыторыі Польшчы, падаў заяўку на рэгістрацыю ў Міністэрства замежных спраў Беларусі. У МЗС запатрабавалі растлумачыць, чаму дагэтуль карэспандэнты каналу працавалі на тэрыторыі краіны без афіцыйнай рэгістрацыі і акрэдытацыі. 24 лютага Гомельская абласная пракуратура вынесла афіцыйнае папярэджанне Таццяне Бублікавай за яе магчымае супрацоўніцтва з Белсатам. 2 сакавіка Міністэрства замежных спраў Беларусі адмовіла Белсату ў рэгістрацыі на падставе тэхнічных недасканаласцяў у дакументацыі. Гэтае рашэнне дэманструе адмову беларускіх уладаў выканаць патрабаванняў студзеньскай рэзалюцыі Еўрапарламента, якая заклікала да таго, каб падача заяўкі была адзіным патрабаваннем да замежных СМІ, у прыватнасці да Белсата, дзеля атрымання акрэдытацыі і рэгістрацыі на Беларусі.

Нарэшце, ужыванне закону “пра супрацьдзеянне экстрэмізму” працягвае замінаць свабодзе СМІ і душыць іншадумства. У лістападзе 2008 г. брэсцкае КДБ накіравала позву ў суд Маскоўскага района ў Брэсце з просьбай дазволіць знішчэнне дзесяці паасобнікаў інтэлектуальнага часопісу “ARCHE”, канфіскаванага мытнікамі на беларуска-польскай мяжы 24 кастрычніка 2008 г. КДБ сцвярджала, што часопіс утрымлівае матэрыялы, што “заклікаюць да экстрэмісцкіх дзеянняў і прапагандуюць такія дзеянні”. 25 студзеня пасля закрытага паседжання суд пастанавіў, што выданне носіць “экстрэмісцкі” характар і падлягае знішчэнню.

Акрамя таго, раённы суд Гродна абвясціў экстрэмісцкай дакументальную стужку польскага рэжысёра “Lekcja Bialoruskiego”. Спіс матэрыялаў, якія палічылі экстрэмісцкімі, сярод іншага ўтрымлівае таксама Хроніку парушэнняў правоў чалавека за 2004 г. і падборку дыскаў з запісам канцэрта, праведзенага польскай ініцыятывай “Solidarni z Białorusią”.

Выпадкі выкарыстання закону пра “супрацьдзеянне экстрэмізму” мелі выбарачны характар і былі скіраваныя супраць апазіцыйных актывістаў з мэтай запалохвання прадстаўнікоў незалежнай грамадзянскай супольнасці.

13 студзеня Мінскі абласны суд пастанавіў аштрафаваць выдаўцу газеты “Барысаўскія навіны” на 48 мільёнаў рублёў, што пагражае незалежнаму выданню банкротствам. Негледзячы на рашэнне Рады Міністраў, паводле якой патрэбы ў зазначэнні інфармацыі аб вынайме гандлёвай пляцоўкі ў ліцэнзіі няма, рашэнне было прынятае на карысць падаткавай інспекцыі, якая сцвярджала аб недакладнасцях у прадстаўленні інфармацыі аб гандлёвай пляцоўцы ў ліцэнзіі выдання. 8 студзеня дзяржаўная друкарня скасавала дамову аб друку незалежнай газеты “Барысаўскія навіны” пасля выдання толькі аднаго нумару. Газета не мае магчымасці заключыць дамовы з Барысаўскімі друкарнямі з 1996.

20 студзеня Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь падтрымаў рашэнне Светлагорстага суда аштрафаваць Віктара Ахрамчука, Святлану Міхальчанку і Дзмітрыя Шаўяленка на 1 400 000 рублёў кожнага за “злоўжыванне свабодай слова ў сродках масавай інфармацыі”. Напярэдадні парламентскіх выбараў 2008 ва ўсіх гэтых сябраў ініцыятыўнай групы аднаго з кандыдатаў ад Аб’яднаных дэмакратычных сіл міліцыя канфіскавала асобнікі незарэгістраванай газэты “Глыток паветра” і інфармацыйны бюлетэнь “Выбары 2008”.

## 3. Свабода асацыяцыяў

З кастрычніка 2008 г. некалькі незалежных структураў былі афіцыйна зарэгістраваныя. Астатнія, на жаль, атрымалі адмову ці яшчэ не атрымалі ніякага адказу. Такім чынам, можна казаць пра тое, што структурнага зруху ў палітыцы ўладаў у гэтай сферы не адбылося.

Рух “За свабоду”, які ўзначальвае былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч, быў зарэгістраваны 17 снежня 2008 г. Гэта была чацвёртая спроба Руху атрымаць рэгістрацыю; усе папярэднія былі адхілены Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Пасля году безвыніковых спробаў 18 снежня 2008 г. была зарэгістравана гомельская філія партыі Беларускі Народны Фронт. Тым не менш, 3 сакавіка 2009 г. заява на рэгістрацыю Праваабарончага цэнтра “Наша Вясна” (зліквідаванага ў 2003 г.) і яго рэгіянальнай філіі ў г. Брэсце была адхілена на падставе спрэчных тэхнічных фармальнасцяў.

Шэраг іншых незалежных нацыянальных арганізацый паўторна падаюць на рэгістрацыю. Сярод іх Асамблея НДА (атрымала адмову ў 2003 г., установчы сход адбыўся 7 лютага, дакументы на рэгістрацыю былі пададзены напачатку сакавіка), Партыя свабоды і прагрэсу (атрымоўвала адмовы тры разы, устаноўчая канферэнцыя запланаваная на сакавік), грамадскае аб’яднанне “За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва”(атрымала адмову ў 2007 г., устаноўчая

канферэнцыя запланаваная на красавік) і Партыя Працоўных (зліквідаваная ў 2004 г., устаноўчая канферэнцыя запланаваная на красавік).

На рэгіянальным узроўні ўрад адмовіў у рэгістрацыі баранавіцкай філіі Беларускай Асацыяцыі Журналістаў, а таксама адмовіў у прадстаўленні юрыдычнай адрэсы вілейскай філіі Беларускага Народнага Фронту, грамадскай асацыяцыі "За Еўрапейскую Мастоўшчыну" і актывістам Маладога Фронту. Толькі магілеўская філія БНФ здолела атрымаць юрыдычны адрас, што дазваляе ёй афіцыйна падаць заяву на рэгістрацыю.

У кастрычніку 2008 г. у афіцыйнай рэгістрацыі было адмоўлена грамадскаму аб'яднанню беларускіх пенсіянераў "Наша пакаленне" і сацыяльна-патрыятычнаму грамадскаму аб'яднанню "Гарызанталь". У лістападзе выканаўчы камітэт г. Магілёва ў сёмы раз адмовіў у рэгістрацыі мясцовай суполцы Незалежнага прафсаюза радыёэлектроннай прамысловасці. Пасля разгляду справы, што цягнуўся ад жніўня 2008 г., улады адмовілі прафсаюзу на падставе таго, што суполка не мае юрыдычнай адрэсы.

Дзве адмовы ў рэгістрацыі знаходзяцца на разглядзе ў Вярхоўным судзе. НДА "Цэнтр падтрымкі Чарнобыльскіх ініцыятыў" і "Гарызанталь" падалі апеляцыю на адмоўнае рашэнне Міністэрства юстыцый.

У кастрычніку 2008 г. актывіст Уладзімір Кацора звярнуўся ў Вярхоўны суд Беларусі з заклікам прытрымлівацца рэзалюцыі Камітэта ААН па правах чалавека, якая дазваляе гомельскай арганізацыі "Грамадскія ініцыятывы" узнавіць сваю дзейнасць. Адпаведныя звароты былі накіраваныя таксама Міністэрству замежных спраў і юстыцыі, але беспаспяхова. Афіцыйная пазіцыя Рэспублікі Беларусь па гэтых пытаннях палягае на тым, што рашэнні гэтага Камітэта ААН не маюць прымусовага характару, што пярэчыць міжнародным абавязкам Рэспублікі Беларусь, прадугледжаным артыкулам 27 Венскай канвенцыі і артыкулам 2 Міжнароднага пагаднення па грамадзянскіх і палітычных правах і яго рэкамендацыйнага пратаколу.

Беларускія ўлады зрабілі пэўныя сымбалічныя крокі для паляпшэння ўмоваў працы беларускіх грамадскіх ініцыятываў праз выданне 19 снежня дэкрэта № 689, які прыпыняе інспекцыю і аўдыт для ўсіх юрыдычных асобаў, у тым ліку грамадскіх ініцыятываў і НДА на тэрмін у шэсць месяцаў. Нягледзячы на гэты дэкрэт Беларускі ПЭН-Цэнтр атрымаў афіцыйнае папярэдчанне за недасканаласці ў працы на падставе інспекцыі яго дзейнасці. Працягваюць існаваць і іншыя формы пераследу, такія як, напрыклад, ператрусы ў прыватных кватэрах і незарэгістраваных установах.

22 студзеня беларускія ўлады дазволілі правесці VI Кангрэс Асамблеі Беларускіх НДА, што адбудзецца 6-7 сакавіка ў Мінску. Традыцыйна Кангрэс збірае сотні грамадскіх арганізацыяў з усёй Беларусі, а таксама замежных гасцей. Негледзячы на афіцыйны дазвол правесці Кангрэс, шэрагу запрошаным міжнародным экспертам было адмоўлена ў візах.

Нягледзячы на рэгістрацыю арганізацыі "Рух за Свабоду", НДА-сябры гэтай арганізацыі працягваюць сутыкацца са складанасцямі пад час арганізацыі грамадскія ініцыятываў. Напрыклад, 26 студзеня НДА "Барніца" з мястэчка Глыбокае, падала заяўку да Мастоўскага раённага выканаўчага камітэту на

правядзенне адкрытай сустрэчы па пытаннях фінансавага крызісу, але атрымала адмову 1 лютага. Актывістам ініцыятывы “За чысты Барысаў” адмовілі ў правядзенні сустрэчы дзеля абмеркавання дакумэнта “Еўрапейскія перспектыва для Барысава” з удзелам Аляксандра Мілінкевіча, узначальваючага руз “За Свабоду”. Актывіст Руху Алесь Зарэмбюк падаваў заяўку ў Мастоўскі райвыканкам на прадстаўленне юрыдычнай адрэсы для асацыяцыі “За Еўрапейскую Мастоўшчыну”, але таксама атрымаў адмову.

У лютым 2008 г. улады распачалі працэс у Вярхоўным Судзе па ліквідацыі зарэгістраванага Беларускага Хельсінскага Камітэта на падставе таго, што арганізацыя не заплаціла падаткі пасля атрымання фінансавай падтрымкі ў рамках праграмы Еўрасаюза ТАСІС у 2002-2003 г. У рэшце рэшт, Міністэртсва Юстыцыі адазвала працэс, але накладзеныя на БХК санкцыі трываюць. Паводле іх, БХК мусіць заплаціць больш за €47,000. У сувязі з гэтым рахунак БХК заблакаваны і ўсе трапляючыя туды сродкі ідуць на пакрыццё запазыкі. БХК з’яўляецца сябрам Міжнароднай Хельсінскай Федэрацыі, якая мае статус дарадцы пра ААН і АБСЕ. У ліпені 2008 БХК атрымала статус арганізацыі-партнёра Рады Еўропы.

## 4. Папраўкі ў выбарчае заканадаўства

22-23 студзеня адбылася сустрэча прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай выбарчай камісіі, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняўі Міністэрства замежных спраў Беларусі з Місіяй БДІПЧ/АБСЕ з мэтай абмеркаваць высновы Канчатковай справаздачы Місіі БДІПЧ/АБСЕ па выніках парламенцкіх выбараў 2008 г. Была дасягнута дамоўленасць, што першы раунд кансультацыяў паміж БДІПЧ/АБСЕ і працоўнай групай беларускіх экспертаў адбудзецца ў лютым 2009 г. Працоўную групу ўзначальвае Валеры Міцкевіч, намеснік старшыні Цэнтральнай Выбарчай Камісіі і дырэктар Нацыянальнага Цэнтра заканадаўства і прававых даследванняў, і ўключае экспертаў у выбарчым заканадаўстве і іншых прававых экспертаў. Да ўдзелу ў групе прадстаўнікі апазіцыйныз палітычных партый запрошаныя не былі.

У сваю чаргу група экспертаў Аб’яднаных дэмакратычных сілаў (АДС) распрацавала праект па ўнясенні зменаў і паправак у Выбарчы кодэкс. Гэты праект быў накіраваны ў Прэзідэнцкую адміністрацыю, БДІПЧ/АБСЕ і Венецыянскую камісію пры Радзе Еўропы. 25 студзеня працоўная група планавала правесці ўстаноўчы сход, каб распачаць збор подпісаў за ўнясенне зменаў у Выбарчы кодэкс, але негледзячы на зварот у 12 установаў, не знайшла месца на правядзенне мерапрыемства. Тады працоўная група звярнулася да ўладаў з просьбай правесці сход на адкрытым паветры 8 лютага, але заяўка засталася без разгляду.

## 5. Свабода ад палітычнага пераследу і незаконных затрыманняў

Колькасць адміністратыўных арыштаў дэмакратычных актывістаў у параўнанне з аналагічным перыядам 2007 г. зменшылася. Сорак чатыры грамадскія актывісты былі прысуджаныя да адміністратыўнага арышту ў кастрычніку – снежні 2007 г., у той час як ў 2008 г. такіх прысудаў было шаснаццаць. Аднак лік актывістаў, аштрафаваных за палітычную дзейнасць, застаўся прыблізна той жа самы: 16 ў кастрычніку – снежні 2007 г., 12 за такі самы перыяд ў 2008 г.

Крымінальныя справы супраць Міхаіла Шарамета і Юрыя Карэтнікава, якіх затрымалі ў сувязі з выбухамі ў Мінску 4 ліпеня 2008 г., былі спыненыя 1 снежня 2008 г. У той жа час адпаведныя справы супраць іншых актывістаў, арыштаваных у сувязі з гэтым інцыдэнтам, закрытыя не былі.

У кастрычніку крымінальныя справы былі ўзбуджаны супраць двух з 14 моладзевых актывістаў, затрыманых за ўдзел у несанкцыяваным пратэсце ў студзені 2008 г. Дэманстрацыя, скіраваная супраць уціску ўладамі дробнага бізнесу, аб'яднала больш за 3000 індывідуальных прадпрымальнікаў і салідарных з імі грамадзян. Судовае разбіральніцтва па гэтай справе атрымала назоў "Працэсу чатырнаццаці". У выніку гэтага працэсу 9 з 14 актывістаў атрымалі па 2 гады абмежавання волі без накіравання ў калонію. У снежні 2008 г. апошні ўдзельнік працэсу 14-ці Аляксандр Баразенка, якога судзілі асобна, атрымаў адзін год абмежавання волі. 23 лютага ў Мінску пад варту за ўхіленне ад адбывання пакарання быў узяты Максім Дашук. На наступны дзень семнаццацігадовага актывіста вызвалілі пад падпіску аб нявыездзе, абвінаваціўшы па артыкуле 415 Крымінальнага кодэксу, што пагражае пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

20 снежня адбылася відавочная спроба незаконнага затрымання Артура Фінкевіча, былога палітвязня і лідэра апазіцыйнай ініцыятывы "Маладая Беларусь". Паведамлялася, што каля дома яго спрабавалі выкрасці асобы ў цывільным. Фінкевіча збілі, адабралі грошы і дакументы і пакінулі ў лесе за межамі Мінска. 26 лютага на беларуска-польскай мяжы ў спадара Фінкевіча быў канфіскаваны ноўтбук.

13 снежня Вышэйшы гаспадарчы суд Беларусі пакінуў у моцы рашэнне Мінгарвыканкама адабраць зямлю і пазбавіць будынка царкву "Новае жыццё". 10 лютага пратэстанцкая супольнасць абскардзіла гэта рашэнне.

3 лютага суддзя гомельскага раённага суда наклаў вялікія штрафы на трох апазіцыйных актывістаў, якія ўдзельнічалі ў мірнай акцыі пратэсту. Уладзімір Жукоўскі быў аштрафаваны на тры з паловай мільёны рублёў, а Андрэй Цянюта і Васіль Такарэнка атрымалі па 2 мільёны 800 тысяч рублёў штрафу за парушэнне парадку правядзення дэманстрацый і ігнараванне законных патрабаванняў міліцыі.

5 лютага пяць актывістаў грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь", затрыманых падчас рэйду міліцыі на адну з прыватных кватэр у Мінску, былі вызвалены без абвінавачванняў. Імёны затрыманых – Павел Юхневіч, Яўген Афнагель, Уладзіслаў Ігнатовіч, Марта Крылова і Аляксандра Лындава. У часеператрусу ў кватэры міліцыянты канфіскавалі два ноўтбукі, фота і відэакамеру, здымкі зніклых грамадскіх дзеячаў, еўрапейскія сцягі і налепкі з рэкламнай кампаніяй "Еўрапейскай Беларусі". Нягледзячы на тое, што ўсе пяць актывістаў былі вызвалены пасля дзвюхгадзіннага затрымання, маёмасць вернутая не была.

6 лютага Мінская гарадская пракуратура зачыніла старую крымінальную справу супраць лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі. Гэта справа была распачата ў 2004 г., пасля таго, як палітык даў інтэрв'ю тэлеканалу "Россия" і беларускай газеце "Народная воля" пра "ценевыя прыбыткі і продаж зброі" беларускім кіраўніцтвам.

8 лютага 3 грамадскія актывісты - Мікалай Аўтуховіч, Юры Лявонаў і Уладзімір Асіпенка - былі арыштаваныя супрацоўнікамі спецыяльнага атраду “Алмаз”. Супраць іх высунутыя абвінавачванні па артыкуле 218 Крымінальнага кодэксу, што пагражае пазбаўленнем волі на тэрмін ад 3 да 12 гадоў. Падчас зняволення Юры Лявонаў быў шпіталізаваны.
Следства мяркуе, што гэтыя грамадзяне маглі ўчыніць шэраг падпалаў у 2005 г., нягледзячы на тое, што вінаватыя ў гэтай справе былі знойдзены і прысуджаны да пакарання. У 2006 г. Аўтуховіча і Лявонава прысудзілі да турэмнага зняволення за эканамічныя злачынствы, аднак абодва былі прызнаныя палітвязнямі. У студзені 2008 г. спадар Аўтуховіч, які з’яўляецца адным з сустаршыняў аргкамітэта па стварэнні арганізацыі вайроў-афганцаў, звярнуўся да ўладаў з петыцыяй аб вяртанні скасаваных ільгот гэтай катэгорыі грамадзян.

У сувязі з гэтай справай упаўнаважаны федэральнага ўрада Германіі па правах чалавека і сябра дэлегацыі еўрапейскіх обмутсменаў Гюнтэр Ноке зрабіў запыт да беларускіх улад, аднак не атрымаў канкрэтнага адказу. 16 лютага дэманстрацыя ў падтрымку арыштаваных была жорстка разагнаная АМАПам.

У лютым двое грамадзян Даніі, Эрлінг Лаурсэн і Рольф Берген, былі дэпартаваныя з Беларусі за “незаконную рэлігійную дзейнасць” пасля затрымання ў часе набажэнстваў у царкве “Жывая вера” ў Гомелі. Спадар Берген вымушаны быў пакінуць Беларусь 11 лютага, а спадар Лаурсэн – 19. На імя епіскапа адной з буйнейшых пратэстанцкіх суполак у Мінску Веньяміна Бруха 16 лютага прыйшла позва ў міліцыю ў сувязі з выбухам 4 ліпеня 2008 г. Варта адзначыць, што грамадзянін Украіны Брух быў дэпартаваны з Беларусі яшчэ 16 кастрычніка 2008 г.

21 лютага 7 сяброў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і два журналісты, Алег Ражкоў і Зміцер Кармазін, былі затрыманы ў Гомелі падчас спробы правесці мірнае шэсце ў Сусветны дзень роднай мовы, абвешчаны ЮНЕСКО. Актывістаў спынілі, калі яны ішлі ўскласці кветкі да помніка Кірыле Тураўскаму. Марыя Тульжанкова, Васіль Такарэнка і Аляксандр Вярцейка былі аштрафаваны. Актывіст Кастусь Жукоўскі прысуджаны да 7 сутак арышту. 26 лютага ён распачаў галадоўку пратэсту.

Улады працягваць пагражаць грамадскім актывістам пераследам па артыкуле 193-1 Крымінальнага кодэксу – дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. У кастрычніку лідэр грамадзянскай ініцыятывы “За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва” Віктар Гарбачоў атрымаў пісьмовае папярэджанне з Барысаўскай пракуратуры. 9 лютага Тэрэза Сілівончык, старшыня філіі незарэгістраванага Саюза палякаў у Баранавічах, атрымала папярэджанне. Гэта першы выпадак вынясення папярэджання сябрам гэтай арганізацыі.

## 6. Свабода сходаў

Ад пачатку перыяду дыялогу ў кастрычніку ў сферы правядзення публічных сходаў сітуацыя была супярэчлівай.

Апазіцыйная палітычная партыя Беларускі Народны Фронт атрымала дазвол на правядзенне 2 лістапада 2008 г. штогадовай акцыі “Дзяды”. Гэта падзея закліканая ўшанаваць памяць продкаў, асабліва ахвяраў палітычных рэпрэсіяў у

перыяд сталінскага тэрору. Апазіцыйная Кансерватыўна-Хрысціянская партыя, разам з незарэгістраванай Беларускай партыяй свабоды, Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй і моладзевай арганізацыяй “Маладая Беларусь” арганізавалі паралельнае, несанкцыянаванае шэсце. Марш сабраў каля тысячы чалавек, міліцыя ў правядзенне абодвух шэсцяў не ўмешвалася. Таксама была дадзена згода на правядзенне арганізацыяй прадпрымальнікаў “Перспектыва” мітынгу ў знак пратэсту супраць зменаў у заканадаўстве, якія значна абмяжоўваюць магчымасці для працы прыватных прадпрымальнікаў.

З іншага боку, беларускія ўлады адмовіліся задаволіць больш за 10 заявак на правядзенне мерапрыемстваў з нагоды 60-х угодак прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. 7 лістапада адбыліся афіцыйныя святкаванні Кастрычніцкай рэвалюцыі, аднак пікеты супрацьлеглага зместу, зладжаныя Маладым Фронтам з асуджэннем камуністычнай ідэалогіі, былі забароненыя. Пяць сябраў Маладога Фронту былі асуджаныя да 3-х дзён адміністратыўнага арышту за правядзенне несанкцыянаваных акцыяў.

31 кастрычніка ўлады забаранілі актывісту Маладога Фронту Дзянісу Карнову правесці дабрачыннае мерапрыемства “Беларускую кнігу дзецям” ў адным з мінскіх падземных пераходаў без тлумачэння прычын адмовы.

У студзені мясцовыя ўлады адмовілі грамадскім актывістам з заходняй Беларусі ў правядзенні шэрага мірных дэманстрацыяў у Маладзечна, Смаргоні і Вілейцы супраць будоўлі атамнай электрастанцыі ў Гарадзенскім рэгіёне. Напярэдадні ўлады не дазволілі незалежным экспертам і грамадскім прадстаўнікам прымаць удзел у працэсе прыняцця рашэння па справе будавання альбо лакалізацыі станцыі нават на кансультатыўным узроўні.

20 студзеня 2009 г. Мінскі абласны суд пакінуў у сіле рашэнне Клецкага раённага суда аштрафаваць Сяргея Панамарова, старшыню незалежнага грамадскага аб’яднання “Ахова помнікаў гісторыі і культуры”, за правядзенне несанкцыянаванай сустрэчы. Хаця папярэдне Клецкі раённы выканаўчы камітэт паведаміў Панамарову, што для сустрэчаў такога кшталту афіцыйны дазвол не патрабуецца.

14 лютага Малады фронт арганізаваў несанкцыянаваную мірную дэманстрацыю пасля некалькіх беспаспяховых спробаў атрымаць афіцыйны дазвол. Падчас мірнага дзеяння, прысвечанага "Дню кахання" адмысловыя падпадзяленні міліцыі збілі дэманстрантаў і ўжываючы сілу выціснула дэманстрантаў з цэнтра Мінска. Некалькі лідэраў Маладога фронту былі затрыманыя да пачатку мерапрыемствы і некалькі дэманстрантаў былі шпіталяваныя пасля разгону. На наступны дзень Савецкі раённы аддзел міліцыі адмовіўся прымаць скаргі ад трох маладых актывістаў, збітых падчас разгону.

13 лютага, дзеячам заснавальнага камітэта апазіцыйнай Беларускай Хрысціянска- дэмакратычнай палітычнай партыі уладамі Мінска было прадстаўлена месца для правядзення ўстаноўчага сходу. Камітэт накіраваў запыты да адзінаццаці афіцыйных установаў. Пасля атрымання дзесятай адмовы, ён папярэдзіў улады аб тым, што канферэнцыя можа адбыцца на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску. У рэшце рэшт сход адбыўся 28 лютага. Хаця па дарозе на мерапрыемства, 11 чальцоў былі затрыманыя Брэсцкай міліцыяй у падазрэнні на трыманне наркотыкаў.

27 студзеня ўрад заснаваў Грамадска-кансультатыўную рады пры адміністрацыі прэзідэнта. Рада складаецца з 29 чыноўнікаў, прадстаўнікоў няўрадавых арганізацый і незалежных экспертаў, у тым ліку апазіцыйных актывістаў. Кансультатыўныя рада была створаная для падвышэння "сацыяльнага, эканамічнага і палітычнага вектару развіцця краіны." Рада правяла сваё першае паседжанне 6 лютага, якое было прысвечана працэдурным пытанням, а таксама парадку дня наступных паседжанняў.

## 7. Свабода ад рэпрэсіяў за грамадскую дзейнасць

Паводле праваабарончага цэнтра "Вясна" з кастрычніка 2007 г. па студзень 2008 г. было зарэгістравана 142 выпадкі адміністратыўнага пераследу дэмакратычных актывістаў. Для параўнання, з ліпеня па верасень 2008 г. такіх выпадкаў было 42.

Нягледзячы на заклікі ЕС устрымацца ад праяваў ціску на студэнтаў, якія займаюцца палітычнай дзейнасцю, улады працягваюць рэпрэсіі супраць маладых дэмакратычных актывістаў: выключаюць палітычна актыўных з універсітэтаў і гвалтоўна забіраюць актывістаў мужчынскага полу ў войска.

У студзені 2009 г. сябра апазіцыйнай палітычнай партыі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Аляксей Змушко быў выключаны з Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

Пасля выключэння са сваіх навучальных установаў, тры моладзевыя дэмакратычныя актывісты Франак Вячорка (Моладзь БНФ), Іван Шыла і Зміцер Хведарук (абодва Малады Фронт) былі гвалтоўна забраныя ў войска ў канцы студзеня 2009 г. Неўзабаве пасля папярэдніх медыцынскіх вызваленняў ад войска, яны былі прызнаныя годнымі да службы, і ўсе трое мелі праблемы са здароўем. На 28 лютага ўсе трое знаходзіліся ў ваенных шпіталях. Цягам году больш за 10 дэмакратычных актывістаў былі падобным чынам прызваныя ў войска.

Старшыня дэлегацыі па адносінах з Беларуссю ў Еўрапарламенце Яцэк Пратасевіч рашуча асудзіў гэтыя дзеянні беларускіх уладаў і заклікаў спыніць "усе формы пераследу актывістаў з моладзевых арганізацыяў…" Дэпутат ЕП адзначыў, што "пытанне пра ўстрыманне ад выкарыстання вайсковага абавязку як сродку палітычных рэпрэсіяў застанецца сярод вызначальных крытэраў ацэнкі сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі на працягу шасцімесячнага перыяду прыпынення дзеяння абмежаванняў на падарожжа для пэўных беларускіх чыноўнікаў". Яцэк Сарыюш-Вольскі, старшыня Камітэта па міжнародных справах пры Еўрапейскім Парламенце, таксама выказаў заклапочанасць прызывамі ў войска дэмакратычнай моладзі.

Праваабарончы цэнтр "Вясна" паведамляе, што ў разглядаемы перыяд тры грамадскія актывісты страцілі працу па палітычных прычынах. Эксперты лічаць, што пакуль існуе кантрактная сістэма,якая дазваляе наймальніку не тлумачыць прычыны адмовы ўзнавіць працоўны кантракт, існуюць і будуць існаваць выпадкі злоўжывання гэтым палажэннем і выкарыстання яго як сродку аказання ціску на грамадскіх актывістаў.

У снежні моладзевы актывіст Аляксей Шыдлоўскі, які неаднаразова трапляў за краты за сваю палітычную дзейнасць, атрымаў разам з жонкай палітычны прытулак у Чэшскай Рэспубліцы.

## 8. Развіццё сітуацыі ў сферы лібералізацыі эканомікі

Мірныя пратэсты супраць празмернага ўмяшання дзяржавы ў эканоміку працягваюць падаўляцца пры дапамозе судовых працэсаў. 9 снежня прадпрымальніца з Наваполацка Яўгенія Бачурная была асуджаная на шэсць год зняволення. Лічыцца, што спадарыню Бачурную пакаралі за блакіраванне інвестыцыяў у вялікіх памерах, якія мелася унесці расійская кампанія. Падчас расследавання справа незаконным чынам была пераведзена з юрысдыкцыі гаспадарчага суда ў крымінальны.

10 снежня адбыўся агульнанацыянальны 24-гадзінны страйк індывідуальных прадпрымальнікаў. Рынкі не працавалі па ўсёй краіне. Прыблізна 60 працэнтаў прадпрымальнікаў пратэставалі супраць адмены падатковых ільготаў і супраць мыта на тавары, што імпартуюцца з Расіі. 15 снежня дазволены ўладамі мітынг, які быў арганізаваны аб’яднаннем прадпрымальнікаў “Перспектыва”, сабраў на плошчы Бангалор у Мінску каля 3 тысяч чалавек. Міліцыя не ўмешвалася.

Што датычыць долі павелічэння прыватнага сектару ў эканоміцы, то нягледзячы на спіс з 519 дзяржаўных аб’ектаў, што падлягаюць прыватызацыі да 2010 году (з іх 176 да канца 2008 г.), на сярэдзіну лютага 2009 г. было прыватызавана толькі два. Такім чынам, пераважная частка эканомікі па-ранейшаму застаецца ў руках дзяржавы.

31 снежня ўрад выдаў распараджэнне аб стварэнні міжустаноўскай рабочай групы для выпрацоўкі плана дзеяння па развіццю краінавага маркетынгу. У Групу ўключылі прадстаўнікоў улады ад Міністэрстваў замежных справаў і фінансаў, маркетолагаў і двух незалежных экспертаў – кіраўніка навукова-даследчага цэнтру “Мізес” Яраслава Раманчука  і кіраўніка сацыялагічнай лабараторыі “Новак” Андрэя Вардамацкага. У студзені адбылося дзве сустрэчы. Незалежныя эксперты падалі свае прапановы кіраўніку Групы 16 студзеня. Напрыканцы студзеня спадар Раманчук пакінуў Групу, паколькі ягоныя прапановы былі праігнараваныя. 4 лютага Група падала варыянт маркетынгавай стратэгіі у Савет Міністраў. Невядома, ці дадзены дакумент утрымлівае нейкія з ідэяў, што былі прапанаваныя незалежнымі экспертамі.

21-22 студзеня прыкладна 150 прадстаўнікоў дзяржавы, працаўнікоў і прафсаюзаў наведалі канферэнцыю ў Мінску, якая была арганізавана Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП) ў супрацоўніцтве з Кангрэсам дэмакратычных прафесійных саюзаў. У 2004 г. МАП сфармулявала 12 рэкамендацыяў, каб адмяніць рэпрэсіі незалежных прафсаюзаў беларускім урадам. У снежні 2006 г., паколькі урад не паважаў правы незалежных прафсаюзаў і не выконваў рэкамендацыі МАП, Еўрасаюз пазбавіў Беларусь гандлёвых прэферэнцый у межах Генеральнай сістэмы прэферэнцый.

У лістападзе 2008 г. Адміністрайцыйная Рада МАП апублікавала ацэнку дзеянняў урада, якія назвала недастатковымі намаганні ў выкананні рэкамендацый, а таксама адзначыла правал па пытанні забеспячэння правоў прафсаюзаў. У студзені 2009 г. МАП арганізавала сэмінар па прымяненні

рэкамендацый. У выніку, беларускі ўрад прадставіў свой План дзеянняў згодна з рэкамендацыямі МАП.

20 лютага Нацыянальная рада па працоўных і сацыяльных пытаннях ухваліла План дзеянняў урада па выкананні рэкамендацый МАП. Самы значны аспект Плана дзеянняў – гэта пашырэнне Рады па паляпшэнні сацыяльнага і працоўнага заканадаўства за кошт незалежных экспертаў. Рада прадугледжвае выкананне рэкамендацый МАП, у яе ўваходзяць 7 прадстаўнікоў ураду і 7 незалежных экспертаў, яе ўзначальвае міністр працы і сацыяльнай абароны. Згодна з Планам дзеянняў Рада палепшыць умовы для стварэння і рэгістрацыі прафесійных саюзаў, а таксама сумесна з Міністэрствам юстыцыі расследуе выпадкі зацягвання ці адмовы ў рэгістрацыі прафесійных саюзаў. Урад таксама паабяцаў разглядзець скаргі па парушэнні правоў прафесійных саюзаў. Асабліва значна тое, што Рада плануе даследаваць заканадаўства на прадмет замежнай дапамогі, масавых акцый і прапанаваць "рацыянальная рашэнне", каб прывесці яго ў згоду з міжнароднымі стандартамі і прынцыпамі. З моманту сустрэчы 20 лютага ніякага прагрэсу не было заўважана.